Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 2. С. 56–60

УДК 930(477)«19/20»:271.4(476)-9«1720»

# ЗАМОЙСКІ СІНОД 1720 г. У АДЛЮСТРАВАННІ ЎКРАІНСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XX – ПАЧАТАК XXI ст.)

UDC 930(477)«19/20»:271.4(476)-9«1720»

# ZAMOŚĆ SYNOD OF 1720 IN REFLECTION OF UKRAINIAN HISTORIOGRAPHY (THE SECOND HALF OF THE 20TH – THE BEGINNING OF THE 21ST CENTURY)

**С. Ф. Верамееў,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*загадчык кафедры філасофіі*
*і спецыяльных гістарычных дысцыплін*
*ГДУ імя Францыска Скарыны*

**S. Verameev,**
*PhD in History, Head of the Department*
*of Philosophy and Special Historical*
*Disciplines, Gomel State University named*
*after Francisk Skoryna*

Паступіў у рэдакцыю 13.02.22.

Received on 13.02.22

У дадзеным артыкуле разглядаецца ўкраінская гістарыяграфія Замойскага сінода ўніяцкай царквы. Адзначаецца, што большасць прац па дадзенай тэме была створана на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. Аўтар артыкула вылучае асноўныя пытанні, якія ўздымаюцца ў працах украінскіх даследчыкаў. Гэта прычыны склікання сінода, матывы прызначэння яго старшынёй Папскага нунцыя, аўтарства пастановаў, значэнне Замойскага сінода. Найбольшыя дыскусіі выклікае апошняе пытанне. Пераважае меркаванне аб станоўчым значэнні Замойскага сінода, з ім звязваюць пачатак «залатога перыяду» ў гісторыі ўніяцкай царквы. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі распрацоўваюцца новыя тэмы (напрыклад, падрыхтоўка грэка-каталіцкага духавенства пасля 1720 г.), вядзецца пошук новых метадалагічных падыходаў і больш карэктнай навуковай тэрміналогіі.

*Ключавыя словы:* Замойскі сінод 1720 г., Руская ўніяцкая царква, Кіеўская мітраполія, сінадальныя пастановы, украінская гістарыяграфія.

This article considers Ukrainian historiography of Zamość synod of Uniate Church. It is marked that majority of works on this topic were created during the second half of the 20th – the beginning of the 21st century. The author singles out the main questions arising in the works of Ukrainian researchers. These are the reasons of synod summoning, motives of appointment of Pope's nuncio as its foreman, the authorship of provisions, the meaning of Zamość synod. The most disputable is the latter issue. The opinion about positive meaning of Zamość synod, the beginning of the "golden age" in the history of Uniate Church is associated with it. In modern Belarusian historiography new topics are developed (for example, training of Greek-Catholic clergy after 1720), search for new methodological approaches and more correct scientific terminology is being carried out.

*Keywords:* Zamość synod of 1720, Ruthenian Uniate Church, Kiev metropolitanate, synod provisions, Ukrainian historiography.

*Уводзіны.* Замойскі сінод (сабор) 1720 г. з'яўляецца адной з самых важных падзей ў гісторыі ўніяцкай царквы на беларускіх і ўкраінскіх землях. Яго рашэнні шмат у чым прадвызначылі далейшае развіццё ўніяцтва, а асобныя элементы яго спадчыны у рознай ступені прысутнічаюць і ў сучасным царкоўным жыцці беларускіх і ўкраінскіх грэка-католікаў. Разам з тым, на наш погляд, дзейнасць Замойскага сінода вывучана ў беларускай гістарыяграфіі яшчэ недастаткова, а яго значэнне слаба асэнсавана. У кантэксце далейшага даследавання гэтай тэмы варта звярнуцца да напрацовак украінскіх гісторыкаў, каб скарыстаць іх навуковыя дасягненні ці пазбегнуць магчымых гістарычных памылак пры рэканструкцыі мінулага.

*Асноўная частка.* Большасць навуковай літаратуры, прысвечанай дзейнасці Замойскага сінода, з'явілася ва ўкраінскай гістарыяграфіі на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. Калі ў савецкай Украіне спецыяльных даследаванняў па гэтай праблеме не праводзілася, то ў асяроддзі ўкраінскай эміграцыі, наадварот, у другой палове XX ст. з'явіўся шэраг адпаведных публікацый. Іх аўтарамі былі прадстаўнікі грэка-каталіцкай царквы, у тым ліку манаскай супольнасці базыльянаў (Чын святога Васіля Вялікага): І. Назарка, А. Вялікі, Ю. Фёдараў [1–3]. Так, у 1962 г. у Рыме выйшла праца І. Назаркі, у якой выкладзены біяграфіі кіеўскіх і галіцкіх уніяцкіх мітрапалітаў. Гісторыя Замойскага сінода закранаецца ў ёй у жыццяпісах мітрапалітаў Льва Кішкі, Афанасія Шаптыцкага і Фларыяна Грабніцкага [1, с. 82–87, 91–92, 98]. Украінскі манах-базыльянін А. Г. Вялікі выдаў шматтомную працу па гісторыі Рускай уніяцкай царквы. Замойскі сінод падрабязна разглядаецца на старонках шостага тома гэтай працы, прысвечанага падзеям XVIII ст. [2, с. 129–164].

Адзначым таксама даследаванне Ю. Фёдарава, апублікаванае ў Рыме ў 1972 г. [3]. У пачатку XXI ст. у Папскім Усходнім Інстытуце ў Рыме была абаронена дысертацыя грэка-каталіцкага святара А. Каргуніка аб крыніцах украінскага партыкулярнага права ў Кодэксе канонаў Усходніх цэркваў (ККУЦ) [4], у якой увага надаецца і пастановам, прынятым у Замосці.

Да вывучэння дзейнасці Замойскага сінода звярнуліся ў постсавецкі час і гісторыкі на тэрыторыі самой Украіны. У 2014 г. у Івана-Франкоўску выйшла праца І. І. Анішчука [5], якая ўяўляе сабой сур'ёзнае гісторыка-юрыдычнае даследаванне дадзенай праблемы. Неабходна адзначыць таксама міжнародны навуковы праект, накіраваны на міждысцыплінарнае вывучэнне гістарычнай ролі Замойскага сінода і яго спадчыны, прымеркаваны да 300-годдзя гэтай падзеі, удзел у якім разам з беларускімі і польскімі навукоўцамі прымалі таксама і навукоўцы з Украіны [6]. У выніку рэалізацыі праекта ў 2021 г. быў выдадзены зборнік, які змяшчае шэраг прац украінскіх даследчыкаў, у тым ліку грунтоўны артыкул В. Рудэйкі [7].

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі існуюць таксама працы, у якіх пытанне аб дзейнасці Замойскага сінода закранаецца ўскосна, у кантэксце разгляду больш шырокіх тэм. У якасці прыклада можна назваць працу львоўскага гісторыка І. Скачыляса [8]. Звесткі аб Замойскім сінодзе ў постсавецкі перыяд з'явіліся таксама на старонках украінскіх энцыклапедычных выданняў [9].

Якія асноўныя пытанні ўздымаюцца ў працах украінскіх гісторыкаў, у рознай ступені прысвечаных дзейнасці Замойскага сінода? Разгледзім іх больш падрабязна.

У цэнтры ўвагі навукоўцаў знаходзіцца пытанне аб прычынах склікання ў Замосці агульнацаркоўнага сінода ўніяцкай Кіеўскай мітраполіі. Украінская гістарыяграфія перш за ўсё звяртае ўвагу на крызісны стан уніяцкай царквы напярэдадні 1720 г., існаваўшую неабходнасць яго пераадолення, стварэнне ўмоў для далейшага развіцця царквы. Крызіс, на думку І. Назаркі, быў выкліканы войнамі XVII – пачатку XVIII ст., негатыўным стаўленнем палякаў да ўніі ў Рэчы Паспалітай і распаўсюджваннем сектанцкіх вучэнняў у тагачасным грамадстве. Галоўнай мэтай сінода І. Назарка назваў «добро душ», якія ў рэлігійным сэнсе былі занядбаны [1, с. 81–82]. А. Г. Вялікі адзначаў неабходнасць выпрацоўкі адзіных нормаў для далейшага развіцця епархій (частка з іх далучылася да ўніі у канцы XVII – пачатку XVIII ст.), паляпшэння царкоўнай дысцыпліны [2, с. 129]. Ю. Фёдараў лічыў, што сінод быў патрэбны для таго, каб ацаніць вынікі пройдзенага ўніяй шляху, прыняць меры для яе развіцця ў будучыні, адмовіцца ад абрадавай разнастайнасці, лацінскіх элементаў, павысіць узровень адукацыі, узняць дысцыпліну ў манастырах, ліквідаваць злоўжыванні [3, с. 3–4]. А. Каргунік называе яшчэ адну прычыну – жаданне часткі ўніяцкага духавенства захаваць самабытнасць і незалежнасць сваёй царквы ад лацінскага абраду [4, с. 21–23].

Падрабязна прычыны склікання Замойскага сінода разгледжаны ў даследаванні І. І. Анішчука. На яго думку, у пачатку XVIII ст. існавала неабходнасць мадэрнізацыі ўніяцкай царквы, абнаўлення яе ўнутранага жыцця, адаптацыі літургіі і, перш за ўсё, тэалогіі да патрабаванняў эпохі. У тых умовах, на яго погляд, трэба было рэарганізаваць царкву, кадыфікаваць вопыт веры, спыніць «обрядовий хаос» і захаваць царкоўна-абрадавую індывідуальнасць Кіеўскай мітраполіі, умацаваць дысцыпліну ў царкоўным жыцці, вырашыць праблему сіманіі (карупцыі) [5, с. 28, 161].

Украінскія гісторыкі ўздымалі пытанне аб матывах прызначэння старшынёй сіноду Папскага нунцыя Іераніма Грымальдзі і значэнні гэтага факта. І. Назарка назваў адпаведнае рашэнне Папы ўдалым і падкрэсліў, што яно надало сіноду большы аўтарытэт [1, с. 82]. Гэты погляд падзяляе С. Мудры [10, с. 242]. Сваё тлумачэнне прапанаваў І. І. Анішчук. На яго думку, у Рыме асцерагаліся, што ў выпадку прызначэння старшынёй сінода кіеўскага ўніяцкага мітрапаліта Льва Кішкі той можа выкарыстаць свой статус у супрацьстаянні з манахамі-базыльянамі з мэтай паслаблення пазіцый апошніх. У сваю чаргу, Л. Кішка быў незадаволены такім рашэннем Святога Пасада, што ў выніку затрымала пачатак працы сінода [5, с. 32–33].

У публікацыях украінскіх гісторыкаў разглядалася пытанне аб аўтарстве пастаноў Замойскага сінода. І. Назарка лічыў іх галоўным аўтарам мітрапаліта Льва Кішку [1, с. 83]. Аднак іншыя даследчыкі займаюць па гэтым пытанні больш асцярожную пазіцыю. Так, на думку Ю. Фёдарава, гістарычныя крыніцы не ўтрымліваюць інфармацыі аб тым, які ўплыў аказалі айцы сабора на канчатковую рэдакцыю яго актаў [3, с. 24]. Асобна адзначым артыкул В. Рудэйкі, у якім ён упершыню ставіць пытанне аб асэнсаванні літургійнай рэформы маскоўскага патрыярха Нікана ўдзельнікамі сінода [7, с. 178].

Найбольшую ўвагу ўкраінская гістарыяграфія надае ацэнцы значэння Замойскага сінода ў гісторыі ўніяцкай царквы. Пры гэтым, як паказвае аналіз прац, дадзенае пытанне з'яўляецца найбольш дыскусійным. Украінская гістарыяграфія не адмаўляе таго факта, што

замойскія пастановы замацавалі шэраг элементаў, уласцівых лацінскаму абраду, у царкоўным жыцці ўніяцкай Кіеўскай мітраполіі, аднак інтэрпрэтуе дадзенае рашэнне па-рознаму. Частка гісторыкаў ставіцца да яго адмоўна. На думку Ю. Фёдарава, сінод увёў змены, якія не зусім стасуюцца з папярэднімі заявамі рымскіх пантыфікаў пра недатыкальнасць усходняга (візантыйскага) абраду. Замойскі сінод, на яго думку, тым самым пачаў лацінізацыю ўніяцкай царквы [3, с. 15]. Ю. Мыцык, прама не выкарыстоўваючы тэрмін «лацінізацыя», разам з тым, піша, што ў выніку адбылося паглыбленне абрадавых і арганізацыйных разыходжанняў паміж праваслаўнымі і ўніятамі і збліжэнне апошніх з вернікамі лацінскага абраду [9].

Аднак большая частка даследчыкаў займае іншую пазіцыю па гэтым пытанні. На думку І. Скачыляса, Замойскі сінод 1720 г. не пачынаў лацінізацыі, а кадыфікаваў тыя змены, якія ўжо адбыліся ў этасе царквы ў другой палове XVII – першых двух дзесяцігоддзях XVIII ст. [8, с. 8]. І. І. Анішчук падкрэслівае, што сінод імкнуўся захаваць усходні абрад у ўніяцкай царкве. У Замосці, на яго погляд, былі замацаваны тыя нормы і звычаі, якія ўжо сфарміраваліся ў папярэдні час у царкоўным асяроддзі пад уплывам шматлікіх фактараў. Іх замацаванне, на думку І. І. Анішчука, сведчыць аб глабальным вымярэнні хрысціянства, бо ўніяцкая царква такім спосабам звярталася і да візантыйскай, і да заходняй хрысціянскай традыцый [5, с. 36]. У тым, што Замойскі сінод імкнуўся захаваць усходні абрад у Рускай царкве, не сумняваюцца і іншыя даследчыкі, у прыватнасці, А. Каргунік. Ён адзначае, што ў Замосці была зацверджана невялікая колькасць змен, прычым у ўсходні абрад уключаліся тыя элементы, якія прыцягвалі ўніяцкіх вернікаў у лацінскім абрадзе (напрыклад, выкарыстанне званочкаў падчас набажэнства і інш.) [4, с. 228–230]. На погляд А. Каргуніка, рашэнні айцоў сінода стварылі своеасаблівы бар'ер на шляху пранікнення як лацінскіх элементаў у Рускую ўніяцкую царкву, так і ўплыву на яе «нез'єдиненого Сходу» (нез'яднанага Усходу. – *С. В.*) [4, с. 226]. В. Рудэйка таксама лічыць, што удзельнікі сінода ў Замосці не імкнуліся да лацінізацыі ўніяцкай царквы. Ён звяртае ўвагу на незадаволенне прынятымі пастановамі як з боку праваслаўных, так і сімпатызантаў лацінскага абраду. У далейшым, як слушна адзначае В. Рудэйка, гэта прывяло да ўзнікнення ў Рускай уніяцкай царкве руху за вяртанне да «чыстага» візантыйскага абраду [7, с. 178–179]. Са свайго боку адзначым, што ў сінадальных актах прама заяўлялася аб неабходнасці захавання ўсходняга абраду ў Кіеўскай мітраполіі [11, с. 145], таму вышэйназваныя аўтары маюць рацыю.

Украінскія даследчыкі падкрэсліваюць станоўчае значэнне Замойскага сінода. А. Г. Вялікі адзначаў, што ў Замосці было вырашана шмат царкоўных праблем: літургічных, душпастырскіх і інш. [2, с. 149]. А. Каргунік адзначае ролю сінадальных пастановаў у процідзеянні распаўсюджвання вучэння піліпонаў (адзін з кірункаў у стараабрадніцтве) у грамадстве [4, с. 15]. І. І. Анішчук звяртае ўвагу на захаванне аўтэнтычнасці Рускай уніяцкай царквы шляхам замацавання абрадавых пастановаў у друкаваных літургічных тэкстах [5, с. 123–124].

Большая частка ўкраінскіх гісторыкаў, якія звярталіся да разглядаемай тэмы, падзяляюць тэзіс аб тым, што замойскія пастановы стварылі перадумовы для «залатога перыяду» гісторыі Рускай уніяцкай царквы [5, с. 123–124; 10, с. 242; 12, с. 197]. Такога пункту гледжання, у прыватнасці, прытрымліваўся грэка-каталіцкі епіскап Сафрон Мудры. У сваёй працы ён адзначаў, што характэрнымі рысамі «залатога перыяду» з'яўлялася актыўнае рэлігійнае жыццё, якое прынесла шмат пладоў, у тым ліку гераічнае пакутніцтва грэка-католікоў у рэчышчы супрацьстаяння савецкаму атэізму у ХХ ст. [10, с. 242]. Г. Лужніцкі галоўным дасягненнем Замосця называе «життєву певність» («жыццёвую ўпэўненасць». – *С. В.*) Рускай уніяцкай царквы, якая, на яго погляд, пачынаючы з 1720 г. стала выходзіць на міжнародную арэну як паўнапраўны член Каталіцкай царквы, хаця адначасова адрозненні ўніятаў з неўніятамі ўзмацніліся [13, с. 411]. Адрозную пазіцыю займаў гісторык царквы М. Чубаты, які пісаў пра інспіраванне Замойскім сінодам унутрыцаркоўнай барацьбы паміж свецкім духавенствам і базыльянамі, аднак не патлумачыў, якімі менавіта рашэннямі яна была інспіравана [14, с. 13].

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі можна заўважыць тэндэнцыю надання сіноду ў Замосці ўкраінскага нацыянальнага характару. Яшчэ Ю. Фёдараў у сваёй працы адзначаў, што гэта быў «перший Синод Помісної Української Церкви після злуки з Римом» («першы Сінод Памеснай Украінскай царквы пасля ўніі з Рымам». – *С. В.)* [3, с. 3]. Гэты тэзіс быў пераняты і іншымі гісторыкамі. Так, Г. Лужніцкі прама называе сінод у Замосці «українським національным собором» («украінскім нацыянальным саборам». – *С. В.*) [13, с. 410]. Такая трактоўка прадстаўляецца некарэктнай з навуковага пункту гледжання, бо ў Замойскім сінодзе прымалі ўдзел прадстаўнікі ўсіх епархій уніяцкай Кіеўскай мітраполіі, якая, як вядома, ахоплівала не толькі ўкраінскія землі, але і беларускія, а таксама польскія.

Украінскія даследчыкі аналізавалі кананічную спадчыну Замойскага сінода. А. Каргунік звяртае ўвагу на тое, што яго рашэнні былі пакладзены ў аснову пастановаў Львоўскага сабору 1891 г. [4, с. 15]. І. І. Анішчук у сваёй працы адзначае таксама вялікую ролю замойскіх пастаноў у развіцці мясцовага (партыкулярнага) права ўніяцкай царквы, іх аўтарытэтнасць у Каталіцкай царкве: амаль 150 канонаў Замойскага сінода нароўні з апостальскімі канонамі і рашэннямі сусветных сабораў сталі крыніцамі для сучаснага Кодэксу канонаў Усходніх Царкваў (ККУЦ), які быў прыняты ў 1990 г. і дзейнічае дагэтуль [5, с. 14, 146].

Сярод найноўшых даследаванняў адзначым публікацыі Р. Астроўскага, у якіх разглядаецца пытанне аб выхаванні і падрыхтоўцы грэка-каталіцкага духавенства ў постсінадальны час [15]. Р. Астроўскі звяртае ўвагу на тое, што сінод прыняў рашэнне аб заснаванні школ для манахаў і свецкіх на роднай мове, заахвочваў да навучання прадстаўнікоў найбяднейшых груп насельніцтва [16].

Адзначым таксама, што ва ўкраінскай гістарыяграфіі рабіліся спробы навуковай ацэнкі гістарыяграфічных здабыткаў у рэчышчы вывучэння Замойскага сінода. Так, І. Скачыляс вылучае ў гістарыяграфіі «чорную» і «белую» легенды. Да ліку прадстаўнікоў «чорнай» легенды ён адносіць дарэвалюцыйных даследчыкаў Расійскай імперыі (Г. Хрусцэвіча і інш.) [8, с. 8], якія разглядалі дзейнасць Замойскага сінода з пазіцый афіцыйнага праваслаўя і займалі вельмі крытычную пазіцыю ў гэтым пытанні. У чым сутнасць «белай» легенды, з працы І. Скачыляса застаецца незразумелым. В. Рудэйка слушна звярнуў увагу на тэндэнцыю інтэрпрэтацыі пастаноў Замойскага сінода праз прызму праваслаўна-каталіцкай і польска-ўкраінскай палемік, дамінаванне наратываў, што сфарміраваліся на працягу мінулых стагоддзяў і абцяжараны тагачаснай ідэалогіяй, што ўскладняе аб'ектыўную ацэнку Замосця [17].

Украінскія даследчыкі на сучасным этапе ўздымалі пытанне аб метадалогіі далейшага вывучэння дзейнасці Замойскага сінода. М. Журба падкрэслівае эфектыўнасць выкарыстання ў гэтым кірунку цывілізацыйнай метадалогіі (у межах школы Аналаў) [18]. А. Браславец звяртае ўвагу на карэктнасць выкарыстоўваемай тэрміналогіі. На яго думку, тэрміны «Польшча», «паланізацыя», «лацінізацыя», «акаталічванне» няўдалыя. У прыватнасці, выкарыстанне дэфініцыі «лацінізацыя» стварае ўражанне, што ў той час адбывалася гвалтоўнае навязванне лацінскіх дэфініцый, абрадаў, рытуалаў і культавых практык. А. Браславец прапануе ў якасці альтэрнатывы тэрмін «рымацэнтрычнасць», пад якім трэба разумець асаблівы тып і спосаб мыслення, а не кананічна-інстытуцыянальную прыналежнасць [19].

*Заключэнне.* Такім чынам, ва ўкраінскай гістарыяграфіі на працягу другой паловы XX – пачатку XXI ст. быў створаны шэраг прац, у якіх у рознай ступені разглядалася дзейнасць Замойскага сінода 1720 г. Многія з іх аўтараў належалі ці належаць да грэка-каталіцкай царквы. Асноўныя пытанні, якія знаходзяцца ў цэнтры ўвагі даследчыкаў, наступныя: прычыны склікання агульнацаркоўнага сінода, матывы прызначэння яго старшынёй Папскага нунцыя (а не ўніяцкага мітрапаліта) і значэнне гэтага факта; аўтарства сінадальных пастаноў; гістарычнае значэнне Замойскага сінода. Найбольш дыскусійным з'яўляецца апошняе пытанне. У найноўшай украінскай гістарыяграфіі ўздымаюцца новыя тэмы (падрыхтоўка грэка-каталіцкага духавенства ў постсінадальны час), назіраецца пошук новых метадалагічных падыходаў і больш карэктнай навуковай тэрміналогіі для далейшага ўсебаковага вывучэння Замойскага сінода 1720 г.

*Літаратура*


1. *Назарко, І.* Київські і Галицькі Митрополити. Біографічні нариси (1590-1960) / І. Назарко. – Рим, 1962. – 272 с.
2. *Великий, А. Г.* З літопису Християнської України / А. Г. Великий. – Рим : Видавництво ОО. Василіян, 1973. – 286 с.
3. *Федорів, Ю.* Замойський Синод 1720 р. / Ю. Федорів. – Рим : Видання «Богословії», 1972. – 71 с.
4. *Коргуник А.* Джерела Українського партикулярного права в ККСЦ: Замойський 1720 р. та Львівський 1891 р. Синоди : докторська дисертація, Рим, 2002. – 251 с.
5. *Онищук, І. І.* Замойський синод 1720 р. Історично-юридичний аналіз / І. І Онищук. – Івано-Франківськ, 2014. – 274 с.
6. Synod Zamojski 1720-2020. Polska-Białoruś-Ukraina. – Рэжым доступу: https://synodzamojski.upjp2.edu.pl/. – Дата доступу: 05.01.2022.


*References*


1. *Nazarko, I.* Kiïvski i Galic'ki Mitropoliti. Biografichni narisi (1590-1960) / I. Nazarko. – Rim, 1962. – 272 s.
2. *Velikij, A. G.* Z litopisu Hristiyans'koï Ukraïni / A. G. Velikij. – Rim : Vidavnictvo OO. Vasiliyan, 1973. – 286 s.
3. *Fedoriv, Yu.* Zamojs'kij Sinod 1720 r. / Yu. Fedoriv. – Rim : Vidannya «Bogoslovii», 1972. – 71 s.
4. *Korgunik A.* Dzherela Ukraïn'skogo partikulyarnogo prava v KKSC: Zamojs'kij 1720 r. ta L'vivs'kij 1891 r. Sinodi : doktors'ka disertaciya, Rim, 2002. – 251 s.
5. *Onishchuk, I. I.* Zamojs'kij sinod 1720 r. Istorichno-yuridichnij analiz / I. I Onishchuk. – Ivano-Frankivs'k, 2014. – 274 s.
6. Synod Zamojski 1720-2020. Polska-Białoruś-Ukraina. – Rezhym dostupu: https://synodzamojski.upjp2.edu.pl/. – Data dostupu: 05.01.2022.

7. *Рудейко, В.* Літургійна традиція Української Греко-Католицької Церкви з огляду на постанови Замойського синоду 1720: спроба контекстуалізації / В. Рудейко // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. – Krakow : Technet, 2021. – С. 167–179
8. *Скочиляс, І.* Релігія та культура Західної Волині на початку XVIII ст. За матеріалами Володимирського собору 1715 р. / І. Скочиляс. – Львів, 2008. – 80 с.
9. *Мицик, Ю. А.* Замойський собор української греко–католицької церкви 1720 / Ю. А. Мицик // Енциклопедія історії України: Т. 3: Е-Й / Редкол.: В. А. Смолій (голова) та ін. – К.: В-во "Наукова думка", 2005. – 672 с. – Режим доступу: http://www.history.org.ua/?termin=Zamoysky_sobor. – Дата доступу: 21.02.2020.
10. *Мудрий, С.* Нарис історії Церкви в Україні / о. Софрон Мудрий. – Рим-Львів : Видавництво оо.василіян, 1995. – 405 с.
11. Acta Synodi Zamosciensis Anno MDCCXX – Statuty Synodu Zamojskiego 1720 roku // Statuty Synodu Zamojskiego 1720 roku / Red. naukowa P. Nowakowski CM. – Krakow, 2020. – С. 29–274.
12. *Островський, Р.* Проблема виховання і формації греко-католицького духовенства після Замойського синоду / Р. Островський // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. – Krakow : Technet, 2021. – С. 195-218.
13. *Лужницький, Г.* Українська церква між Сходом і Заходом / Г. Лужницький. – Філадельфія: Провидінне, 1954. – 723 с.
14. *Чубатий, М.* Українська Католицька Церква / М. Чубатий. – Львів : Місійне згромадженне св. Кирила і Методія, 1992. – 24 с.
15. *Островський, Р.* Проблема виховання і формації греко-католицького духовенства після Замойського синоду / Р. Островський // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. Krakow : Technet, 2021. – С. 195-218
16. *Островський, Р.* Питання формації унійного духовенства після Замойського Синоду / о. Dr. Р. Островський. – Режим доступу: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/team/dr-roman-ostrovskyy/. – Дата доступу: 21.02.2020.
17. *Рудейко, В.* Багатокультурна спадщина Речі Посполитої у виокресленні європейської ментальності слов'ян центрально-східної Європи. Інтердисциплінарні дослідження латинських впливів на візантійсько-слов'янську культуру, натхнені 300-літтям Замойського синоду / В. Рудейко. – Режим доступу: https://synodzamojski.upjp2.edu.pl/. – Дата доступу: 05.01.2022.
18. *Журба, М.* Феномен Синоду Замойського у контексті модерних методологічних практик / М. Журба. – Режим доступу: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/wp-content/uploads/2020/01/Zhurba. – Дата доступу: 05.01.2022.
19. *Браславець, О.* Modus orandi est modus vivendi. Методологічні нотатки з нагоди 300-річчя Замойського синоду / О. Браславець. – Режим доступу: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/team/mgr-oleksii-braslavets/. – Дата доступу: 05.01.2022.

7. *Rudejko, V.* Liturgijna tradiciya Ukraïns'koï Greko-Katolic'koï Cerkvi z oglyadu na postanovi Zamojs'kogo sinodu 1720: sproba kontekstualizaciï / V. Rudejko // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. – Krakow : Technet, 2021. – S. 167–179
8. *Skochilyas, I.* Religiya ta kul'tura Zahidnoï Volini na pochatku XVIII st. Za materialami Volodimirs'kogo soboru 1715 r. / I. Skochilyas. – L'viv, 2008. – 80 s.
9. *Micik, Yu. A.* Zamojs'kij sobor ukraïns'koï greko–katolic'koï cerkvi 1720 / Yu. A. Micik // Enciklopediya istoriï Ukraïni: T. 3: E-J / Redkol.: V. A. Smolij (golova) ta in. – K.: V-vo "Naukova dumka", 2005. – 672 s. – Rezhim dostupu: http://www.history.org.ua/?termin=Zamoysky_sobor. – Data dostupu: 21.02.2020.
10. *Mudrij, S.* Naris istoriï Cerkvi v Ukraïni / o. Sofron Mudrij. – Rim-L'viv : Vidavnictvo oo.vasiliyan, 1995. – 405 s.
11. Acta Synodi Zamosciensis Anno MDCCXX – Statuty Synodu Zamojskiego 1720 roku // Statuty Synodu Zamojskiego 1720 roku / Red. naukowa P. Nowakowski CM. – Krakow, 2020. – C. 29–274.
12. *Ostrovs'kij, R.* Problema vihovannya i formaciï greko-katolic'kogo duhovenstva pislya Zamojs'kogo sinodu / R. Ostrovs'kij // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. – Krakow : Technet, 2021. – S. 195-218.
13. *Luzhnic'kij, G.* Ukraïns'ka cerkva mizh Skhodom i Zahodom / G. Luzhnic'kij. – Filadelfiya: Providinne, 1954. – 723 s.
14. *Chubatij, M.* Ukraïns'ka Katolic'ka Cerkva / M. Chubatij. – L'viv : Misijne zgromadzhenne sv. Kirila i Metodiya, 1992. – 24 s.
15. *Ostrovs'kij, R.* Problema vihovannya i formaciï greko-katolic'kogo duhovenstva pislya Zamojs'kogo sinodu / R. Ostrovs'kij // Dziedzictwo Synodu Zamojskiego 1720-2020. Wyzwania i perspektywy / Redakcja naukowa Pr. Nowakowski CM. Krakow : Technet, 2021. – S. 195-218
16. *Ostrovs'kij, R.* Pitannya formaciï unijnogo duhovenstva pislya Zamojs'kogo Sinodu / o. Dr. R. Ostrovs'kij. – Rezhim dostupu: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/team/dr-roman-ostrovskyy/. – Data dostupu: 21.02.2020.
17. *Rudejko, V.* Bagatokul'turna spadshchina Rechi Pospolitoï u viokreslenni єvropejs'koï mental'nosti slov'yan central'no-skhidnoï Єvropi. Interdisciplinarni doslidzhennya latins'kih vpliviv na vizantijs'ko-slov'yans'ku kul'turu, nathneni 300-littyam Zamojs'kogo sinodu / V. Rudejko. – Rezhim dostupu: https://synodzamojski.upjp2.edu.pl/. – Data dostupu: 05.01.2022.
18. *Zhurba, M.* Fenomen Sinodu Zamojs'kogo u konteksti modernih metodologichnih praktik / M. Zhurba. – Rezhim dostupu: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/wp-content/uploads/2020/01/Zhurba. – Data dostupu: 05.01.2022.
19. *Braslavec', O.* Modus orandi est modus vivendi. Metodologichni notatki z nagodi 300-richchya Zamojs'kogo sinodu / O. Braslavec'. – Rezhim dostupu: http://synodzamojski.upjp2.edu.pl/team/mgr-oleksii-braslavets/. – Data dostupu: 05.01.2022.